*Наталля Мазурына*

# ПЕРАЙМАННЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ СПЕВАЎ ВА ЎМОВАХ СУЧАСНАГА ГОРАДА
## *(на прыкладзе дзіцячага фальклорнага фальклорнага гурта «Рада», г.Мінск)*

Паводле статыстычных дадзеных, большасць маладога насельніцтва Рэспублікі Беларусь з'яўляецца гараджанамі. Зразумела, што гэта акалічнасць становіцца вызначальнай пры распрацоўцы падыходаў для захавання і пераймання традыцый беларускіх народных спеваў. Этнамузыколагі, фалькларысты, педагогі разумеюць гэту спецыфіку сённяшняй гісторыка-культурнай сітуацыі ў беларускім грамадстве. Кожны з іх у сваю чаргу прапануе і ажыццяўляе такі шлях, які бачыць плённым. Для педагогаў шмат у чым вызначальнай з'яўляецца ўстанова адукацыі, у сценах і ў межах вучэбных праграм якой можа ісці праца над захаваннем каранёвай культуры нашага народа.

Выдатным прыкладам захавання і пераймання традыцый беларускіх народных спеваў ва ўмовах сучаснага горада з'яўляецца фальклорны гурт «Рада» Дзіцячай школы мастацтваў № 17 г.Мінска, якім кіруе Ірэна Станіславаўна Катвіцкая – прафесійная спявачка, выдатны хармайстар, глыбокі даследчык, таленавіты кампазітар. Удзельнікамі гурта з'яўляюцца дзеці ва ўзросце ад 6 да 17 гадоў.

Мастацкі кіраўнік І. С. Катвіцкая вядзе сістэматычную работу з дзецьмі згодна аўтарскай вучэбнай праграме, асноўнай мэтай якой з'яўляецца вывучэнне беларускай песеннай традыцыі ізахаванне нацыянальнай культуры. Задачамі пастаўлены выкананне беларускіх традыцыйных напеваў у адпаведнай стылю і жанру манеры; авалоданне вакальнай тэхнікай і спецыфічнымі рысамі рэгіянальных традыцый выканання; выхаванне фальклорнага песеннага мыслення, здольнасцей да імправізаванага падыходу і самастойнага асэнсавання структуры, жанра і стылю напеваў.

Падчас заняткаў адным з галоўных момантаў з'яўляецца выкарыстанне аўдыё- і відэаматэрыялаў з экспедыцый, архіваў з узорамі рэальнага гучання.Для выканання напеву адпаведна яго гісторыка-стылявому кантэксту неабходна багатая слыхавая практыка, якая фарміруецца пры дэталёвым аналізе вакальна-тэхнічных сродкаў музычнай выразнасці, жанравых і стылявых асаблівасцей. Пры наяўнасці ў аўдыёілюстрацыях напеваў аднаго жанру і аднаго арэала ёсць магчымасць вывучэння яскравых індывідуальных стыляў таленавітых спевакоў з народнага асяроддзя.Праца з аўдыёматэрыяламі не носіць характару безумоўнагакапіравання, але становіцца свядомай імітацыяй жывой песеннай інтанацыі, бо носьбіты традыцыі – у асноўным, людзі сталага ўзросту, што, зрэдку, адбіваецца на якасці гуку (недакладнае інтанаванне, цяжкае дыханне, дэфекты артыкуляцыі і г. д.).

Пры рабоце над народнай песняй паслядоўна здзяйсняюцца два падыходы: арыентацыя на арыгінальнае, *аўтэнтычнае* гучанне і на *сцэнічны* жанр, абмежаваны рамкамі эстрадна-тэатральнай эстэтыкі.

У адпаведнасці з храналагічна-гістарычным прынцыпам паслядоўнасці вывучэнне традыцыйных спеваў пачынаецца з больш старадаўніх песенных пластоў: каляндарна- і сямейна-абрадавых. Напевы каляндарных і сямейна-бытавых святаў, падмуркам песеннай нацыянальнай традыцыі, маюць у сабе цяжкія для ўспрымання інтанацыйна-меладычныя асновы, метра-рытмічны комплекс і архаічныя ладавыя сістэмы. Менавіта на гэтых напевах праходзіць вывучэнне вакальнай тэхнікі: фаршлагі, глісанда, «скіды», «гуканне» і іншыя прыёмы вакалізацыі.Праца над гэтым музычным матэрыялам фарміруе грунтоўныя паняцці жанру і стылю.

На першым этапе развучвання новага твора прапануецца аўдыёгучанне арыгінала (слыхавая форма ўспрымання). Вусны аналіз з вучнямі механізмаў гукаўтварэння, як адзін з метадаў, дапаўняецца сінхроннымі спевамі пад аўдыёзапіс. Спалучэнне гэтых падыходаў да выканальніцтва дае магчымасць інтуітыўна знайсці патрэбную манеру спеваў. У рэпертуары «Рады» зараз гучаць калядныя «Го-го-го, каза», «Каляда», веснавая «Вясна-красна», веснавы карагод «Ой, бяроза белая», песня з абрада ваджэння і пахавання стралы «Ляцела страла дай удоль сяла», русальная «На граной нядзелі» і іншыя.

Трэба адзначыць, што дзеці-спевакі фальклорнага гурта «Рада»валодаюць як аўтэнтычнай манерай выканання і падачы песень, так і сцэнічнымі варыянтамі іх увасаблення, калі да гучання дадаюцца элементы тэатралізацыі ў стылізаваных касцюмах, сцэнічнай падачы. Песні могуць у такім выпадку злучацца ў дыпціхі (напрыклад, з вясельных песень «Застукацелі, загрукацелі» і «Горэла сосна, полэла»), трыпціхі, гучаць ў сучасных аранжыроўках, якія ствараe спадарыня Ірына.

Засваенне навыкаў выканальніцтва песеннага пласта ранняй традыцыі з'яўляецца падмуркам для вывучэння познетрадыцыйнага фальклору – пазаабрадавых напеваў, лірыкі. Пры гэтым адрозненне знаходзіцца ў іншай вобразна-эмацыянальнай сферы. Фарміраванне мастацкага вобразу выканння такіх песеньадбываецца на аснове глыбокага аналізу музычнага і паэтычнага тэкстаў, праз выяўленне канфлікта ва ўзаемаадносінах герояў, у іх асабістых перажываннях, а таксама характару і ўмоў існавання жанра песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома, што этнакультура Беларусі аб’ядноўвае субкультуры пяці асноўных рэгіёнаў, якія адрозніваюцца паміж сабой традыцыямі і, галоўнае, песеннымі комплексамі. Своеасаблівасці кожнага з іх можна прасачыць на формульных, тыпавых напевах у зборніках беларускіх этнамузыколагаў (серыя БНТ, рэгіянальныя зборнікі).Прынцып паслядоўнасці навучання, звязаны з паняццем «ад лёгкага да цяжкага», дае падставу планавання працы наступным чынам: пачынаць з матэрыялу Паазер’я з перавагай унісонна-гетэрафоннага віда шматгалосся, потым – Міншчына, Панямонне(двухгалоссе з эпізадычным трохгалоссем пры руху паралельнымі тэрцыямі, квінтамі, секстамі), Падняпроў’е(гетэрафонія «з пералівамі», двухгалоссе з падводкай), і, як самая складаная для выканання сістэма, – Палессе(гетэрафонія, гетэрафонія з бурдонам, шматгалоссе з кантрастным падгалоскам).

І. С. Катвіцкая арганізоўвае дзейнасць гурта нібы адзінага вакальнага арганізма, у якім асноўным з’яўляецца «спетасць» паміж партыямі і кожным з выканаўцаў, пачуццё формы твору, фактуры напеву.Мэтанакіраванае вывучэнне фальклорных спеваў па прапанаванай методыцы дае магчымасць вучням авалодаць навыкамі *імправізацыі* ў межах законаў народнай песеннай творчасці.Методыка спрыяе захаванню і пераймання жывога інтанавання, а таксама адэкватнаму традыцыям выкананню песеннага фальклорнага матэрыяла з апублікаваных расшыфраваных напеваў.

У выніку працы згодна апісанай праграмедзеці і падлеткі не страчваюць сувязь з культурнай спадчынай народа, змяняюцца многія жыццёвыя арыенціры падрастаючага пакалення. У кожным ўзросце ўдзельнікі фолькгурта «Рада» развіваюцца і фарміруюцца як асобы з нацыянальнай годнасцю.

Знаёмства з беларускімі песнямі ў малодшым школьным узросце праз розныя актыўныя формы дзейнасці зацікаўлівае дзяцей і стварае падмурак для далейшага, больш глыбокога вывучэння народнай і прафесійнай музычнай культуры і гісторыі сваёй краіны ў старэйшых классах. Гульні, гутаркі, спевы, танцавальныя рухі, ігра на такіхмузычных інструментах, як каробачка, бразготкі, бубен, акарына і іншыя, спрыяюць засваенню музычнага матэрыяла праз зразумелыя для малодшых школьнікаў сродкі. Сумеснае музіцыраванне, ігра ў ансамблі вырашае многія задачы і праблемы зносін. Сарамлівае дзіця становіцца ўдзельнікам агульнай справы, неўтаймаванае – падпарадкуецца адзінай, строгай задуме, адораны ўвасабляе свае творчыя фантазіі. Становіцца зразумелай каштоўнасць кожнага ў агульнай справе, і дзеці адчуваюць гэта. На такіх занятках у працэсе калектыўнага музіцыравання фарміруецца эмацыянальная сфера дзіцяці, яго душэўнае здароўе. Інструментальнае музіцыраванне самым цесным чынам звязана са слуханнем музыкі, вакальна-харавым выкананнем, імправізацыяй.

Пры вывучэнні старажытнай спеўнай культуры праз народныя песніў падлеткаў і моладзі закладваюцца маральныя якасці, павышаецца агульны ўзровень культуры, адбываецца раскрыццё асабістых якасцей, развіваецца камунікатыўная культура. Музыка аказвае ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці: адбываецца станаўленне сапраўднага грамадзяніна з актыўнай сацыяльнай пазіцыяй, з творчым і пазітыўным падыходам да жыцця. Выхоўваецца культурна развіты, неабыякавы чалавек, здольны асэнсаваць нацыянальна-культурныя традыцыі і выкарыстоўваць атрыманыя веды ў сучасным жыцці.

Для навучэнцаў выпускных класаў далучэнне да традыцыйнай беларускай спеўнай культуры адчыняе дарогу да выканальніцкай творчасці і навуковых даследаванняў. На базе матэрыяла заняткаў традыцыйнымі спевамі юныя выканаўцы могуць вывучаць стылістычную манеру спеваў пэўнага рэгіёна, пашыраць веды па старажытнаму інструментарыю, займацца творчай інтэрпрытацыяй твораў народнапесеннай культуры, рабіць цікавейшыя эксперыменты па спалучэнні стылёвых элементаў традыцыйных спеваў і найноўшых музычных вынаходніцтваў.

Фальклорны гурт «Рада» неаднаразова выступаў на сцэнах рознага ўзроўню ад школьных да філарманічных, паспяховаўдзельнічаў у рэспубліканскіх і міжнародных фальклорна-этнаграфічных фестывалях, з’яўляецца неаднаразовым лаўрэатам у розных намінацыях. Гэта важна. Але важней тое, што **дзеці жывуцьсваімі народнымі песнямі**, напяваюць іх, імправізуюць, самастойна актыўна абмяркоўваюць поспехі і недахопы выступленняў, паводзяць сябе як **самастойныя прафесійныя традыцыйныя выканаўцы-стваральнікі**(як бы гэта ні парадаксальна гучала). Навучыць такому дзяцей-гараджан – велізарнейшае дасягненне Ірэны Катвіцкай.

У народным мастацтве закладзены невычарпальны выхаваўча-педагагічны патэнцыял, які пры жаданні могуць выкарыстоўваць этнапедагогі, выкладчыкі і выхавацелі. Нягледзячы на змены ўсучаснай культурнай сітуацыі,мы назіраем з’яву пераасэнсавання аўтэнтычнага фальклору, пранікнення яго ў горад і прыстасавання да новых умоваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ